значна павялічвае маштабы творчасці, ён звязаны з эстэтычным бокам працэсу стварэння. Эстэтычнае стала неад'емнай часткай новай прадукцыі творчай дзейнасці чалавека. Эстэтычнае пачуццё – адзін з фактараў матывацыі творчасці, у тым ліку і ў навуковай працы.

У цяперашні час больш, чым калі-небудзь раней, ёсць неабходнасць у высокаадукаваных спецыялістах, здольных выйсці за рамкі традыцыйнага мыслення і раскрыць сябе ў творчым імпэце. Чалавек, які можа творча падыходзіць да вырашэння прафесійных задач, рэалізуе пры гэтым і сваю стратэгію, і стратэгію паводзін, і стратэгію жыцця.

Адукацыі належыць выкананне адказных функцый: рыхтаваць чалавека да жыцця і ўзнаўляць " высокія веды", трасфармаваць агульначалавечыя і нацыянальныя культурныя каштоўнасці на ўзровень індывіда. На парозе новага тысячагоддзя нам неабходна ажыццявіць чарговую пераацэнку каштоўнасцей, адмовіцца ад шаблоннага ўспрымання існуючых рэалій і выпрацаваць у сабе сапраўды творчыя адносіны да жыцця.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

***Шырокава В.І., дацэнт***

## РОЛЯ КУРСА АРКЕСТРАВАЙ ЛІТАРАТУРЫ Ў ПАДРЫХТОЎЦЫ КІРАЎНІКОЎ АРКЕСТРАЎ НАРОДНЫХ ІНСТРУМЕНТАЎ

Лекцыйны курс аркестравай літаратуры чытаюць студэнтам Беларускага універсітэта культуры нядаўна. Увядзенне гэтага курса ў навучальны план абумоўлена спробай палепшыць якасць падрыхтоўкі будучых кіраўнікоў аркестраў народных інструментаў.

Заўважана: студэнты, што заканчваюць ВНУ культуры, атрымліваюць добрую дырыжорскую падрыхтоўку, але ў прафесійнай дзейнасці сутыкаюцца з цяжка вырашальнымі пытаннямі: дзе ўзяць рэпертуар, якая нотная

літаратура існуе для аркестра пэўнага складу, што за жанры народна-інструментальнай музыкі развіваюцца цяпер, якія творы сімфанічнай музыкі можна без скажэння арыгінала перакласці для выканання народным аркестрам і г.д. Для адказу на гэтыя пытанні неабходны агульнатэарэтычныя веды аб фарміраванні, развіцці айчыннага народна-інструментальнага выканання, жанрах народна-інструментальнай музыкі, аўтарскіх стылях кампазітараў.

Гэта стала падставай для распрацоўкі лекцыйнага курса аркестравай літаратуры, вырашэння задачы пашырэння музычна-культурнага кругагляду студэнта на аснове вывучэння лепшых узораў народна-інструментальнай музыкі, набыцця ведаў па аркестравай літаратуры розных жанраў і рэпертуары для народных інструментаў, а таксама развіцця навыкаў аналізу аркестравых твораў.

Праграмай курса прадугледжаны лекцыйныя, семінарскія заняткі, а для студэнтаў факультэта завочнага навучання – выкананне пісьмовай кантрольнай работы. Выбар тэмы вызначаецца прыкладнай тэматыкай кантрольных работ, здзяйсняецца на ўстановачнай лекцыі па ўзгадненні з выкладчыкам. Пры напісанні кантрольных работ больш увагі надаюць праблемам развіцця народна-інструментальнай музыкі 70—90-х гг., калі творчасць беларускіх кампазітараў (Дз.Смольскага, Я.Глебава, В. Помазава, А.Мдзівані, В. Іванова і інш.) была вельмі плённай. Напрыклад, выбіраюць тэмы: “Канцэрты для цымбал Дз.Смольскага як этапныя творы беларускага народна-інструментальнага выканання”, “Творчая дзейнасць В.Помазава і А.Мдзівані ў жанры народна-інструментальнай музыкі”, “Стылістычныя асаблівасці музыкі для беларускага аркестра В.Іванова” і г.д.

Кожны раздзел лекцыйнага курса завяршаюць семінарскія заняткі, на якіх падагульняецца вывучаны матэрыял, засяроджваецца ўвага на праблемах народна-аркестравага выканання. Так, другія семінарскія заняткі прысвечаны разбору асноўных жанраў музыкі для аркестра рускіх народных інструментаў, на трэціх семінарскіх

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

занятках аналізуюцца жанрава-стылявыя асаблівасці твораў беларускіх кампазітараў для цымбальнага аркестра і інш. На занятках важна стварыць атмасферу нявымушаных адносін, свабоднага абмену думкамі. Студэнты выступаюць на іх у ролі музычных крытыкаў, выказваюць уласныя меркаванні пра вартасць твораў, адметнасць творчасці асобных кампазітараў або новыя тэндэнцыі ў музыцы для аркестраў народных інструментаў, узаемадзеянне стыляў у межах індывідуальнага стылю кампазітара і г.д. Такім чынам, на семінарскіх занятках фарміруюцца асновы музычна-крытычнага мыслення.

Экзамен (на ФЗН залік) складаецца з дзвюх частак, тэарэтычнай і практычнай. Па тэорыі прапануюцца два пытанні, якія датычацца праблем развіцця жанру. Пры адказе на першае з іх патрабуюць даць характарыстыку народна-інструментальнага выканання або народна-інструментальнай музыкі пэўнай гістарычнай эпохі (“Сольнае і ансамблевае выкананне на тэрыторыі Беларусі ў дарэвалюцыйны перыяд”, “Развіццё выканальніцкага майстэрства і аркестраў рускіх народных інструментаў у перыяд 1917–1945 гг.”, “Характэрныя асаблівасці беларускай народна-інструментальнай музыкі 70-х гг.” і інш.).

Другое пытанне тычыцца творчасці асобнага кампазітара альбо вядомага дзеяча ў галіне народна-інструментальнай музыкі (“Творчасць М.Будашкіна”, “Творчая дзейнасць І. Жыновіча”). Яно можа быць звязана з аналізам твора буйной формы для аркестра народных інструментаў (аналіз “Канцэрта для ўдарных з аркестрам рускіх народных інструментаў” Ю.Шышакова, сімфоніі “Памяць зямлі” А. Мдзівані і інш.).

Практычная частка экзамену (заліку) – віктарына, якая прадугледжвае праверку ведання музычных твораў на слых. Студэнтам прапануюць для праслухоўвання 10 музычных урыўкаў працягласцю гучання 1—2 хвіліны кожны. Неабходна назваць аўтара, твор, яго жанр, таксама нумар часткі ў творах буйной цыклічнай формы. У выпадку, калі

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

неабходная колькасць музычных нумароў не вызначана, студэнт атрымлівае нездавальняючую адзнаку.

Для папярэдняга праслухоўвання і засваення студэнту дзённай формы навучання прапануюць 90 фоназапісаў музычных твораў для аркестраў з розным складам, а студэнтам завочнай – у два разы менш. Падрыхтоўка да віктарыны з'яўляецца найбольш адказным момантам самастойнай працы студэнтаў: яна патрабуе ўвагі, актыўнасці мыслення, напружання памяці, прымянення шматлікіх метадаў самастойнай работы, умення карыстацца тэхнічнымі сродкамі навучання (прайгравальнікам, магнітафонам і інш.).

Вывучэнне аркестравых твораў у фоназапісе пашырае музычны кругагляд студэнтаў, знаёміць з невядомымі ім творамі для аркестра народных інструментаў, садзейнічае развіццю тэмбральнага слыху, музычнай памяці. Імкненне запомніць музычны матэрыял актывізуе разумовыя працэсы. Услухоўваючыся ў музыку, студэнт праводзіць параўнальны аналіз, вучыцца знаходзіць адрозненні ў музыцы аўтараў, напрыклад у гарманізацыі народных песень У.Насонава, М.Фаміна, спосабах апрацоўкі і аркестроўкі М.Будашкіна, Ю.Шышакова, выкарыстанні новых прыёмаў распрацоўкі фальклорнага матэрыялу ў творчасці В.Помазава, А.Мдзівані. Слыхавым аналізам ахопліваецца ўся сукупнасць сродкаў выразнасці: мелодыка, рытміка, лад, поліфанія, інструментоўка і г.д. У ходзе праслухоўвання студэнты аналізуюць вобразны змест твора, тэмбрава-выяўленчыя сродкі аркестра, ролю хору ў выканаўча-інструментальных жанрах (араторыя "Родныя песні" Ю.Семянякі, сімфонія "Памяць зямлі" А.Мдзівані), знаёмяцца з новымі тэмбравымі спалучэннямі (гл. "Канцэрт для ўдарных з аркестрам рускіх народных інструментаў" Ю.Шышакова, сюіту-жарт "Вясковыя музыкі" В.Помазава і інш.). Па выніках тэарэтычнай і практычнай частак экзамену (заліку) выстаўляецца агульны бал у заліковую кніжку.

Вывучэнне музыкі для аркестра рускіх народных інструментаў і беларускага цымбальнага аркестра ў адзіным

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

курсе дае магчымасць супаставіць народна-інструментальную культуру двух славянскіх народаў, убачыць шмат агульнага ў станаўленні, развіцці інструментальнай культуры беларускага, рускага народаў раней і цяпер. Працэс узаемнага ўплыву працягваецца і да сённяшняга дня, але нельга не заўважаць імкнення захоўваць самабытнасць культуры кожным народам, што выяўляецца ў музычна-славеснай традыцыі, інтанацыйнай своеасаблівасці, рысах інструментальна-тэмбравай палітры і г.д.

Курс аркестравай літаратуры мае сувязь з аркестравым класам, дырыжыраваннем, інструментоўкай, чытаннем аркестравых партытур. Пры вывучэнні прадмета актуалізуюцца веды, якія студэнты набываюць у час вывучэння курсаў гармоніі, тэорыі музыкі, поліфаніі, аналізе музычных форм, іншых музычна-тэарэтычных дысцыплін. Змяненне яго месца ў навучальным плане, перанясенне дысцыпліны на апошні курс парушаюць міжпрадметныя сувязі, пазбаўляюць студэнтаў магчымасці прымянення атрыманых ведаў у аркестравым класе, пры падрыхтоўцы да дзяржэкзамену. У пачатку пятага курса зацвярджаецца дзяржэкзаменацыйная праграма студэнтаў для аркестраў і ансамбляў народных інструментаў. Да гэтага студэнты стацыянара, завочнага аддзялення павінны выбраць адпаведныя творы, чаму дапамагае курс аркестравай літаратуры. Але па існуючым плане яго чытаюць у X семестры. Гэта ўскладняе працэс выбару твораў для дзяржэкзамену. Адсюль узнікае патрэба чытання курса ў VIII семестры.

Студэнты і выкладчык сустракаюцца з іншымі цяжкасцямі. Так, у апошнія гады на вывучэнне названай дысцыпліны ў два разы зменшана колькасць вучэбных гадзін на факультэце завочнага навучання. Гэта не дазваляе выкладчыку падаць матэрыял, неабходны для падрыхтоўкі да заліку, нават агляднa. Калі прыняць пад увагу факт, што па прадмеце адсутнічаюць падручнікі, вучэбныя дапаможнікі, дык стане зразумела, якія ж цяжкасці маюць студэнты-завочнікі ў самастойнай працы. Вельмі важна будзе аднавіць друкаванне лекцый выкладчыкаў па новых дысцыплінах,

што дазволіць паглыбіць прафесійныя веды студэнтаў факультэта мастацкай творчасці.

Трэба звярнуць увагу і на недахопы забеспячэння навучальнага працэсу сучаснымі тэхнічнымі сродкамі. Лекцыі па аркестравай літаратуры прадугледжваюць не толькі аналіз рэпертуару, вызначэнне жанрава-стылёвых асаблівасцей твораў, але і суправаджэнне тлумачэнняў гучаннем музычных урыўкаў, праецыраваннем на экране партытурнага радка, нотных прыкладаў і інш. Гэта спрыяе лепшаму засваенню тэарэтычнага матэрыялу. Таму для правядзення заняткаў па спецыяльных музычных дысцыплінах, патрэбны аўдыторыі, абсталяваныя аўдыёвізуальнымі сродкамі.

Курс аркестравай літаратуры звязаны таксама з работай бібліятэкі. Адсюль вынікае задача бесперапыннага камплектавання нотна-музычнага аддзела яе тэарэтычнай, музычна-крытычнай, нотнай літаратурай.

Праблема рэпертуару для аркестраў і ансамбляў народных інструментаў заўсёды актуальная. 27—30 студзеня 1998 года ў Беларускім інстытуце праблем культуры праходзіў семінар кіраўнікоў дзіцячых фальклорных калектываў. На думку ўдзельнікаў семінара, найбольшая цяжкасць, з якой яны сустракаюцца ў практычнай творчай дзейнасці, звязана з падборам рэпертуару для дзіцячых аркестраў, ансамбляў народных інструментаў. Тут можна канстатаваць амаль поўную адсутнасць партытур, нотнага матэрыялу для дзіцячых інструментальных калектываў. Праблему ўяўляюць і аранжыроўкі, інструментоўка, перакладанне твораў для такіх калектываў. Таму хацелася б, каб беларускія кампазітары звярнулі ўвагу на стварэнне дзіцячага рэпертуару, напісанне арыгінальных твораў для аркестраў, ансамбляў народных інструментаў, удзельнікі якіх – дзеці.

РЭПАЗІТОРЫЙ БДУКІ